УДК 947.6(=411.6) (1914/1916)

# ДЗЕЙНАСЦЬ МАРЫІ БАЧКАРОВАЙ І ЯЕ “БАТАЛЬЁНА СМЕРЦІ” НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

**М.В. Цуба**

Палескі дзяржаўны ўніверсітэт, cubanm05@rambler.ru

Нягледзячы на вялікую колькасць выдадзенай літаратуры ў апошні час прысвечанай гісторыі жыцця і баявой дзейнасці Марыі Бачкаровай і яе жаночага батальёна смерці па дадзенай тэматыцы існуе шмат неразгаданых белых плям. Асабліва гэта датычыцца пытанняў звязаных з ваеннай службай Марыі Бачкаровай на землях Беларусі, а таксама падрыхтоўкай і ўдзелам у баі жаночага батальёна пад яе кіраўніцтвам падчас Крэўскай аперацыі 1917 года. Сама асоба Марыі Бачкаровай вельмі славутая. У свой час яна мела неверагодную вядомасць і аўтарытэт. У гэтым плане дастаткова нагадаць, што яна неаднаразова сустракалася з кіраўніком Часовага ўрада А. Ф. Керанскім, старшыней III і IV Дзяржаўных Дум М. У. Радзянко, была асабіста знаёма з расійскімі генераламі А. А. Брусілавым, А. І. Дзянікіным , Л. Г. Карнілавым. Яе афіцыйна прымалі прэзідэнт ЗША Вудро Вільсан і англійскі кароль Георг V. У гады Грамадзянскай вайны Марыю Бачкарову стараліся пераманіць на свой бок і белыя, і чырвоныя. І хаця не мелася яўных доказаў, што яна ўдзельнічала ў “контррэвалюцыйнай дзейнасці” па загаду бальшавіцкіх уладаў яе якабы растралялі 16 мая 1920 года. Хаця дакументаў аб выкананні растрэльнага прыгавора дасюль не знойдзена. У гэты час ёй ішоў усяго 31 год.

Пасля няўдалых замужастваў Марыя Лявонцьеўна Фралкова спачатку з Афанасіем Бачкаровым, а затым з Якавам Букам вярнулася да бацькоў у горад Томск. Тут яна даведалася аб пачатку Першай сусветнай вайны і ў хуткім часе накіравала тэлеграму на імя самога імператара Мікалая II, выказваючы жаданне пайсці на вайсковую службу. Пасля дазволу цара яе залічылі радавой у 25 Томскі рэзервовы батальён. Такім чынам Марыя захавала за сабой прозвішча першага мужа, а на службе запатрабавала называць сябе “Яшкай”, такое імя насіў другі яе муж. Згодна з аўтабіяграфічнай звесткай Марыя Бачкарова напісала наступнае:

“У гэтым батальёне я засвоіла вайсковую навуку і стральбу, а праз два з паловай месяцы была накіравана з маршавай ротай на фронт пад Маладзечна. Па прыбыццю на фронт маршавая рота

была прыкамандзіравана да 28 Полацкага палка, які ўваходзіў у 7 дывізію пятага армейскага корпуса”[1, с.78].

Разам з іншымі вайсковымі фарміраваннямі на долю 28 Полацкага палка, што знаходзіўся пад Маладзечна, выпаў лёс любым коштам стрымаць самы вялікі ў Першай сусветнай вайне Свянцянскі прарыў кайзераўскіх войск. У гэтай аперацыі, якая працягвалася болей месяца (канец жніўня – пачатак кастрычніка 1915г.) у напрамку Свянцяны – Вільня – Маладзечна – Мінск удзельнічала палова войск расійскага Заходняга і германскага Усходняга франтоў, адпаведна 394 тысячы з расійскага і 307 тысяч чалавек з германскага боку [2].

Вядомы факт, што менавіта другая армія генерала Смірнова, у якую уваходзіў 28 Полацкі полк, змагла канчаткова спыніць нямецкі наступ. А затым рашуча атакуючы германскія войскі ў раёне Маладзечна нанесла ім паражэнне і вымусіла адступіць, тым самым ліквідаваўшы пагрозу акружэння і захопу Мінска.[3, с.259].

Такім чынам, коштам неверагодных намаганняў і ахвяр расійскаму камандаванню ўдалося часткова ліквідаваць наступствы Свянцянскага прарыву.

Менавіта ў гэтых крывапралітных баях Марыя Бачкарова здабыла сабе славу, паказваючы іншым прыклады смеласці і мужнасці, а ранейшыя насмешкі і гразныя прыставанні саслужыўцаў адыйшлі ў мінулае. Дзяўчына навучылася метка страляць, не раз хадзіла ў штыкавыя атакі, а калі ёй даверылі вайсковае аддзяленне – стала ўмелым камандзірам. За час службы яна чатыры разы была паранена, а падлечыўшыся зноў вярталася ў свой полк. Здзяйсняючы подзвіг за подзвігам Марыя Бачкарова стала поўным Георгіеўскім кавалерам і ўладальнікам чатырох медаляў, яе прадставілі спачатку ў старшыя унтэр-афіцэры, а затым у прапаршчыкі[3, с.160].

Зацягнуўшаяся вайна, паражэнні на фронце, гаспадарчая разруха, палітычны крызіс у вярхах улады прывялі ў краіне да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года. Пасля якой да ўлады прыйшоў Часовы ўрад.

Улічваючы вышэй адзначаныя абставіны прадстаўнікі дадзеннага ўрада часта наведвалі фронт, каб хоць якім чынам падняць маральны дух салдат. Першага мая 1917 года Заходні фронт наведаў вопытны палітык, былы старшыня Дзяржаўнай думы М. У. Радзянко. Менавіта яму, камандзір 28 Полацкага палка падрабязна расказаў аб подзвігах дзяўчыны – дабраахвотніцы з яго палка Марыі Бачкаровай. Пасля чаго Радзянко пажадаў з ёй сустрэцца асабіста і запрасіў неадкладна паехаць з ім у Магілёў, дзе знаходзілася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага, каб вырашыць разам з А. А. Брусілавым прапанову Марыі па стварэнню дабраахвотнага жаночага батальёна.

Па ўспамінах Бачкаровай, Брусілаў падтрымаў яе прапанову, але заўважыў, што гэта будзе першае ў свеце вайсковае жаночае фарміраванне і ён не ўпэўнены ў канчатковым поспеху гэтай задумы. М. Л. Бачкарова ў сваю чаргу заверыла, што калі ёй будуць дадзены неабходныя паўнамоцтвы, то яе батальён не знеслявіць Расію. Затым 22 мая 1917 года па ініцыятыве М. У. Радзянко ў Петраградзе, у Зімнім палацы М. Л. Бачкарова была прадстаўлена кіраўніку Часовага ўрада А. Ф. Керанскаму.

Па намеры Керанскага падобнага роду жаночы атрад павінен быў падняць баявы дух на фронце сярод вялікай колькасці дэмаралізаванных і ахопленых пацыфізмам салдат. Ён верыў, што гэта будзе той ізюмінкай, якая можа кардынальна змяніць ход ваенных дзеянняў на расійска-германскім фронце. Для стварэння такога жаночага батальёна Керанскі задзейнічаў нават сваю жонку і шматлікіх петраградскіх інстытутак, агульнай колькасцю дзве тысячы чалавек [4, с. 265].

З аўтабіяграфічных звестак М. Л. Бачкаровай далей чытаем: “ Мне выдзялілі казарму на Гандлёвай вуліцы ў Петраградзе. Выдалі абмундзіраванне і ўзбраенне, далі інструктараў і я распачала навучэнне свайго батальёна. За гэты перыяд я адкамандзіравала ад сябе 1500 жанчын за іх лёгкія паводзіны і яны ў Інжынерным палацы стварылі з сябе самастойны Ударны батальён і склікалі Усерасійскі з’езд жанчан. А я з 500-мі жанчын засталася фарміравацца. 27 чырвеня 1917 года я прысутнічала пры асвяшчэнні сцяга майго батальёна ў Ісакіеўскім палацы. Генерал Карнілаў у прысутнасці Керанскага і іншых членаў Часовага ўрада затым уручыў мне гэты сцяг [1, с.79].

Так замест мужчын-дэзерціраў для адпраўкі на фронт рыхтавалі атрад жанчын з устрашаючай назвай – “жаночы батальён смерці”. Назва падмацоўвалася тым, што замест какарды на фуражках жанчыны насілі выяву чэрапа з перакрыжаванымі касцьмі. У незвычайным вайсковым фарміраванні царыла жалезная дысцыпліна, вядома, што многія дзяўчаты пісалі скаргі вышэйстаячаму начальству, аб тым, што Бачкарова “б’е морды як запраўскі вахмістр старога рэжыму ”. У выніку

за кароткі тэрмін колькасць жанчын-дабраахвотніц скарацілася да трохсот. Дзвесце з іх выдзеліліся яшчэ у адзін асобны батальён, які затым будзе абараняць Зімні палац падчас кастрычніцкага перавароту [4, с.266]. 1 ліпеня 1917 года жаночы батальён смерці на чале з М.Бачкаровай быў накіраваны на фронт у месца службы яго камандзіра пад Маладзечна, але на гэты раз быў прыкамандзіраваны да 10-й арміі 1-га Сібірскага корпуса, якім камандаваў генерал Я.А.Іскрыцкі. Праз пару дзён дадзены корпус быў перадыслацыраваны ў раён Смаргоні, дзе павінна было адбыцца буйнамаштабнае ліпеньскае наступленне расійскіх войск, абяцанае А.Ф.Керанскім саюзнікам па Антанце. Менавіта гэтае наступленне стала жахлівым баявым хрышчэннем для байцоў жаночага батальёна смерці, які займаў пазіцыі паміж Крэва і Наваспаскам [5, с.190]. Аб паводзінах жанчын падчас бою ёсць рознага характару звесткі. У самой Бачкаровай аб гэтым наступе запісана наступнае: “8 ліпеня я з батальёнам удзельнічала ў баі пад Крэва. Узяты дзве лініі нямецкіх акопаў. Калі выйшлі ў Спаскі лес, то салдаты самавольна нас пакінулі на волю лёсу і я засталася з батальёнам адна. Раніцай 9 ліпеня немцы перайшлі ў наступленне і я з батальёнам адступіла. Пры гэтым я была цяжка кантужана і вынесена з поля боя ў несвядомным стане. Мяне накіравалі ў Петраград , у лазарэт Кеніга, дзе я праляжала паўтара месяца. За гэты бой я была прадстаўлена к залатой зброі. ” [1, с.79].

Пра тое, як праявілі сябе падчас бою жанчыны, паведамляе ў сваіх успамінах генерал А.І.Дзянікін: “Жаночы батальён доблесна перайшоў у атаку, не падтыманы “рускімі волатамі”. І калі распачалося сапраўднае пекла ад варожага артылерыйскага агню, бедныя жанчыны , забыўшыся пра тэхніку рассыпнога строю, сціснуліся ў кучку — бездапаможныя, адзінокія на сваім участку поля, узрыхленага нямецкімі бомбамі. Панеслі страты. А “волаты” часткова вярнуліся назад, часткова зусім не пакідалі акопаў” [6, с.57].

У выніку дзве жанчыны загінулі , больш за 30 атрымалі раненні і кантузіі. Камандзір батальёна Марыя Бачкарова пасля гэтага бою былі шпіталізавана. Астатнія жанчыны, па сведчаннях відавочцаў, яшчэ доўгі час знаходзіліся ў глыбокім шоку ад перажытага. Маральны дух батальёна быў зломаны і ў далейшым у баявых дзеяннях ён удзелу не прымаў [7, с.51]. Тым ня менш смеласць і мужнасць самой Марыі Бачкаровай у гэтым баі зрабілі незабыўнае ўражанне на генерала Антона Дзянікіна, які дарэчы і прадставіў яе на ўзнагароджанне залатой зброяй.

Пасля лячэння ў Петраградзе і выздараўлення Марыя Бачкарова атрымала загад ад генерала Карнілава па-ранейшаму на фронце, за кошт іншых жаночых фарміраванняў. Але наведаўшы гэтыя фарміраванні Бачкарова зрабіла выснову, што яны не прыгодныя для баявой вайсковай справы. Пасля чаго паехала на фронт да свайго старога батальёна зноў на беларускія землі ў раён Маладзечна. Аб чым яна паведамляе так: “На фронце я заняла баявы адрэзак, які разам з батальёнам ахоўвала да звяржэння Керанскага… У сваім батальёне я мітынгі праводзіць забараніла і агітатараў у батальён не дапускала. Бальшавікоў лічыла сваімі ворагамі і ворагамі сваёй Радзімы… Але калі ад савецкай улады атрымала тэлеграму расфарміраваць батальён тут жа гэта зрабіла” [1, с.79]. Далей вядома, што з Беларусі яна з’ехала ў Петраград, а затым у Томск.

Такім чынам, кіраўніцтва Часовага ўрада, улічваючы той факт, што зацягнуўшаяся вайна і паражэнні на фронце аказалі вялізарнае рэвалюцыянізіраванае ўздзеянне на салдат, імкнулася за кошт стварэння жаночых вайсковых фарміраванняў палепшыць мікраклімат сярод салдат і павысіць эфектыўнасць у баявых дзеяннях войскаў. Вядома, што дадзены вопыт быў таксама выкарыстаны ў гады Вялікай Айчынай вайны, дзе прымяненне жанчын мела месца ў авіяцыі, снайперскай справе, партызанскіх фарміраваннях, а не толькі ў звычайнай медыцынскай працы.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Андреев, В. «Мой батальон не острамит России…»/ В. Андреев// Родина. – 1993. – № 8, 9. – С. 78-81.

2. Цэнтральны ваенна-гістарычны архіў Расійскай Федэрацыі (ЦВГА РФ). – С. 666. – Л. 208-209.

3. Календарь «Великая и забытая»: военно-исторический православный календарь 2014. – Москва; Издательство «Николин день», 2013. – 352 с.

4. Голденков, М. А. Первая мировая война: 100 лет мифов/ М. А. Голденков. – Минск: ФУАинформ: 2014. – 288 с.

5. Цуба, М. В. Першая сусветная вайна на Беларусі ў кантэксце сусветных ваенных падзей (грамадскі і ваенны бакі) 1914 – 1918 гг.: Манаграфія / М. В. Цуба. – Пінск : ПалесДу, 2010. – 304 с.

6. Деникин, А. И. Очерки русской смуты / А. И. Деникин. – Будапешт, 1921 – 1926. – Т. 1 – 5, 1922. – Т. 2. – 227 с.

7. Кушнер, В. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны. Смаргоншчына: трагедыя, гераізм, памяць / В. Кушнер. // Беларускі гістарычны часопіс. 2007. – № 6 – С. 44 – 51.